# Нашы юбіляры

## АЛЯКСЕЙ АРСЕНЬЕВІЧ ВОЛК
### (Да 50-годдзя з дня нараджэння)



21 чэрвеня Аляксею Арсеньевічу Волку, дэкану філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна, споўнілася пяцьдзесят гадоў. А. А. Волк нарадзіўся ў вёсцы Мерніца Кобрынскага раёна на Брэстчыне ў сям'і селяніна. У 1949 годзе ён паступіў у БДУ імя У. І. Леніна. Праз пяць гадоў скончыў з адзнакай філалагічны факультэт і атрымаў дыплом літаратурнага супрацоўніка. Яшчэ ў студэнцкай аўдыторыі, у 1952 годзе, А. А. Волк стаў членам Камуністычнай партыі.

Пасля заканчэння універсітэта А. А. Волка накіроўваюць на пасаду дырэктара створанага тады Выдавецтва БДУ. Пяць гадоў кіруе малады спецыяліст выдавецтвам. Для новага выдавецтва гэта былі складаныя гады станаўлення, пошуку свайго профілю, аўтараў і чытачоў. І сваю задачу яно з поспехам вырашыла, у чым немалая заслуга А. А. Волка. У развіццё навуковай, педагагічнай і выдавецкай дзейнасці рэспублікі ён унёс значны ўклад.

У 1959 годзе камуністы БДУ выбралі А. А. Волка сакратаром партыйнай арганізацыі. Работу на гэтай пасадзе ён сумяшчаў з удзелам у працы Ленінскага райкома КПСС у якасці члена яго бюро. Партыйная дзейнасць паглыбіла ўменне працаваць з людзьмі, знаходзіць галоўны кірунак, які адпавядае сучасным патрабаванням, засяроджваць намаганні на выкананні найбольш актуальных задач.

Натуральным было тое, што трыццацігадовы камуніст у 1960 годзе стаў аспірантам кафедры гісторыі КПСС. Сваю кандыдацкую дысертацыю А. А. Волк прысвяціў надзённаму пытанню аб тым, як пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі развівалася кнігавыдавецкая справа ў паслякастрычніцкай Беларусі. Аб актуальнасці тэмы сведчыць і той факт, што першая аўтарская публікацыя па ёй з'явілася ў 1962 годзе ва ўсесаюзным зборніку «Книга». Дысертацыю А. А. Волк абараніў у 1964 годзе. Тады ж ён стаў намеснікам дэкана філалагічнага факультэта, сумяшчаючы гэту пасаду з работай у якасці старшага выкладчыка, а потым, з 1969 года, дацэнта кафедры КПСС гуманітарных факультэтаў. Калі ў 1967 годзе філфак раздзяліўся на філалагічны і факультэт журналістыкі, Аляксей Арсеньевіч стаў дэканам філалагічнага факультэта. Гэту адказную і неспакойную пасаду ён займае нязменна ўжо трынаццаць гадоў.

Навуковая праца А. А. Волка працягваецца галоўным чынам у галіне гісторыі беларускай кнігі. Яго артыкулы па гэтай тэме публікаваліся ў зборніках і часопісах, у тым ліку ў юбілейным зборніку да 450-годдзя беларускага кнігадрукавання. А. А. Волк—сааўтар двойчы выдадзеных «Лекцый па гісторыі КПСС», а таксама «Курса лекцый па гісторыі КПСС». Ён актыўны ўдзельнік падрыхтаванага супрацоўнікамі БДУ першага ў краіне дапаможніка для студэнтаў-філолагаў «Уводзіны ў спецыяльнасць» (1977). У 1977 годзе А. А. Волк у сааўтарстве з А. І. Раковічам апублікаваў вялікую манаграфію «Гісторыя кнігавыдавецкай справы ў Савецкай Беларусі», якая атрымала станоўчыя водгукі грамадскасці.

Здольнасці кіраўніка і педагога, актыўны ўдзел ва ўсёй рабоце філалагічнага факультэта, у арганізацыі вучэбнай і выдавецкай дзейнасці філолагаў, фарміраванні новых кірункаў работы ствараюць А. А. Волку заслужаны аўтарытэт сярод выкладчыцкага калектыву і студэнтаў. Філалагічны факультэт шчыра жадае свайму дэкану ў сувязі з яго пяцідзесяцігоддзем новых поспехаў у працы і шчасця ў жыцці.